4. *Занг, Динь Ле Хонг* Китайская инициатива «Пояс и путь» и ее влияние на формирование новой системы международных отношений / Динь Ле Хонг Занг // Ученые записки Крымского федерального университета имени В. И. Вернадского Философия. Политология. Культурология. – 2019. – № 4. – С. 115–124 . – С. 116.
5. *Зиниша, О. С.* Новый «шёлковый» мировой порядок: мечта или реальность? / О. С. Зиниша // Экономика и социум. – 2016. – № 4. – 730–735. С. 733.
6. *Кулинцев, Ю.* «Один пояс – один путь»: инициатива с китайской спецификой [Электронный ресурс] / Ю. Кулинцев. – Режим доступа: https://russiancouncil.ru/blogs/riacexperts/_1868/. – Дата доступа: 04.09.2023
7. *Розов, Н. С.* Китайский проект «Один пояс и .один путь» в контексте парадигм исторической макросоциологии / Н. С. Розов // Вестник Новосибирского государственного педагогического университета. – 2018. – Т. 8. – № 1. – С. 173–188.
8. *Сереков, Б. А.* Китайский проект «Один пояс – один путь»: проблемы и перспективы реализации / Б. А. Сереков // «Россия и современный мир». – 2018. – № 3. – С. 138–150. С. 140.
9. *Сюань, Цю* Содействие созданию сообщества с единой судьбой с помощью инициативы «Один пояс и один путь» / Цю Сюань // Народный форум. – 2017. – № 36. – С. 36–37.
10. *Цзаньпин, Чжун* «Один пояс – один путь» как новая форма диалога между Китаем и цивилизациями / Чжун Цзаньпин // Ярославский педагогический вестник. – 2018. – № 1. – С. 239–243.
11. *Шупин, Я.* Евразийская инициатива «Большое евразийское партнёрство» и «Один пояс – один путь»: сравнительный анализ / Я. Шупин // Россия вчера, сегодня, завтра. – № 1. – 2023. С. 22. (19–33).
12. *Юнхао, Ван* Основные направления внешней политики Китая в Юго-Восточной Азии: применение инструментов «мягкой силы» / Ван Юнхао // Общество: политика, экономика, право. – 2023. – № 5. С. 62–68. С. 67.

УДК 316-048.35"1950/1969"(476)(091)

# ПРАКТЫКА МАДЭРНІЗАЦЫІ: ГРАМАДСТВА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ Ў 50–60-х гг. ХХ ст.

**Н. А. Поляк**

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, пр. Дзяржынскага, 83, г. Мінск, Беларусь, Polyak77@mail.ru*

Мадэрнізацыйны падыход у разглядзе працэсаў мінулага з'яўляецца новым у нашай навукі. Беларускае грамадства другой паловы 50–60-х гг. ХХ ст. адчула на сабе імклівую індустрыялізацыю эканомікі і пражывала істотныя сацыяльна-дэмаграфічныя змены ў выглядзе вылучэння на першыя пазіцыі «суб'ектаў мадэрнізацыі» – рабочага класу. Практыка мадэрнізацыі ў БССР праходзіла супярэчліва і рэалізоўвалася своеасабліва. Цяжкасці, з якімі сутыкнуўся рабочы клас Савецкай Беларусі былі выкліканы надзвычай імклівым дынамізмам развіцця.

***Ключавы словы:*** мадэрнізацыя; эканамічны рост; новаўвядзенні; сацыяльна-дэмаграфічныя змены; рабочы клас; урбанізацыя; школы рабочай моладзі; гатовы да працы і абароны.

# ПРАКТИКА МОДЕРНИЗАЦИИ: ОБЩЕСТВО СОВЕТСКОЙ БЕЛАРУСИ В 50–60-х гг. XX ст.

**Н. А. Поляк**

*Белорусский государствнный медицинский университет, пр. Держинского 83, г. Минск, Беларусь, Polyak77@mail.ru*

Модернизационный подход изучения процессов прошлого является новым в нашей науке. Белорусское общество второй половины 1950–1960-х годов XX века пережилао бурную индустриализацию экономики и значительные социально-демографические изменения в виде выдвижения на первые позиции «субъектов модернизации» — рабочего класса. Практика модернизации в БССР была противоречивой и осуществлялась своеобразно. Трудности, с которыми столкнулся рабочий класс Советской Белоруссии, были вызваны чрезвычайным динамизмом развития.

***Ключевые слова:*** модернизация; экономический рост; инновации; социально-демографические изменения; рабочий класс; урбанизация; школы рабочей молодежи; готовность к труду и обороне.

# PRACTICE OF MODERNIZATION: SOCIETY OF SOVIET BELARUS IN THE 1950s – 1960s

**N. Poliak**

*Belarusian State Medical University, Dzerzhinsky ave. 83, Minsk, Belarus, Polyak77@mail.ru*

The modernization approach to studying past processes is new in our science. Belarusian society in the second half of the 1950s – 1960s of the 20th century experienced rapid industrialization of the economy and significant socio-demographic changes in the form of the promotion of "subjects of modernization" – the working class – to the first positions. The practice of modernization in the BSSR was contradictory and carried out in a unique way. The difficulties faced by the working class of Soviet Belarus were caused by the extraordinary dynamism of development.

***Keyword:*** modernization, economic growth, innovations, socio-demographic changes, working class, urbanization, schools of working youth, readiness for work and protection.

Сучасная сацыльная рэчаіснасць становіцца больш зразумелай, калі шчыльней угледзіцца ў мінулае. Палітыка савецкай улады, накіраваная на распасюджванне на першы погляд звыклых сёння, але такіх значных для кожнага каштоўнасцей сярод савецкіх людзей, істотна паскорыла мадэрнізацыю грамадства. Распачатая занава палітыка аднаўлення зруйнаванай вайной эканомікі ў БССР, патрабавала хуткіх і дакладных рашэнняў. Савецкая ўлада сфармулявала новыя формы і метады праца з дакладнай сацыяльнай групай, якая была неабходна для прагрэсіўнай трансфармацыі эканомікі – рабочым класам.

Разважаючы над тэмай мадэрнізацыі можна адзначыць, што сама па сабе мадэрнізацыйная тэорыя прыйшла на змену традыцыйным падыходам

у гістарычнай навукі і з’яўлялася варыятыўнай у трактоўкі гістарычнай рэчаіснасці. Для прыхільнікаў мадэрнізацыйнага падыходу ўлік соцыякультурнага кантэксту ў станоўчых эканамічных зменах відавочны і неабходны. Падыход па сутнасці з’яўляецца міждысцыплінарным і па іншаму трактуе рухаючыя сілы, дынаміку і наступствы прагрэсу. Ён прадугледжвае рацыянальны кантроль над прыродным, сацыяльным і навуковым [4, с. 10].

У пасляваеннай Беларусі, дзе акрамя зруйнаванай эканомікі існавала шмат пытанняў звязаных з далучэннем заходніх абласцей да БССР, палітыка Партыі і Урада будавалася ў адпаведнасці з прыярытэтамі індустрыяльнага росту і ў рэчышчы ідэалогіі апекі і клопату над «суб’ектамі мадэрнізму» – рабочым класам [5, с. 284]. У гэтай сувязі неабходна разумець, што прынятыя дзяржавай рашэнні і пастановы стваралі фундамент тагачаснага сацыяльнага ўзаемадзеяння і дэмаграфічных пераўтварэнняў. Менавіта сацыяльны змест тагачасных працэсаў сёння вывучаны слаба і чакае сваіх даследчыкаў.

Што сабой уяўляла беларускае савецкае грамадства ў 50–60-х гг. ХХ ст., можна ўявіць па дадзеным перапісу 1959 года. У БССР налічвалася 8 мільёнаў 60 тысяч чалавек, з іх 31 % гараджане, 69 % сяляне. У сталіцы пражывала 509 500 чалавек. У 1970 г. (у год чарговага перапісу) гарадское насельніцтва некалькі павялічылася і склала 43 % [6, с. 138].

Практычная рэалізацыя абранага Партыяй курса на індустрыяльны рост і развіццё заключалася ў факусіроўкі на мэтавай аўдыторыі. Можна, нават, казаць аб стымуляванні сацыяльнай стратыфікацыі на падставе рода заняткаў. Камуністычная партыя была заціўлена ў павелічэнні колькасці працоўных індустрыяльных прадпрыемстваў і садзейнічала памнажэнню класа рабочых. Рабочым класам, на думку некаторых даследчыкаў, можна назваць людзей занятых ў матэрыяльнай вытворчасці пераважна фізічным трудом і аб’яднаных у клас спецыфічнымі сацыяльнымі каштоўнасцямі [1, с. 170].

Адным з відавочных сродкаў папаўнення рабочай сілы і крокам у фарміраванні рабочага класа ў БССР было навучанне. Часткай глабальнай праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця сталі рашэнні Саўміна БССР і ЦК КП(б)Б аб усенавучы дзяцей БССР ад 7 да 14 гадоў. Такія пастановы мелі сваю практычную рэалізацыю і ў 1955/1956 навучальным годзе кантынгент вучняў VIII–X-ых класаў павялічыўся ў параўнанні з 1950/51 годам у 4 разы, а колькасць сярэдніх школ вырасла на 90 %, у тым ліку ў вёсцы ў 2,5 разы. Значна вырасла колькасць выпускнікоў X класаў: у 1950/1951 – 7 360 чалавек, у 1955/1956 – 51 352 чалавекі [3, с. 64 ]. Істотна садзейнічала папаўненню шэрагаў рабочых прыняцце закона Вярхоўнага Савета БССР ад 1959 г. «Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі». Практыка політэхнічнага, вячэрняга, завочнага, вытворчага навучання, школы камуністычнай працы і інш. павінна была садзейнічацьуздыму прамысловай вытворчасці ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Розныя формы атрымання спецыяльнай адукацыі

(народныя універсітэты, школы эканамічных ведаў, курсы павышэння кваліфікацыі, грамадска-палітычныя курсы і інш.) дапамагалі супрацоўнікам удасканальваць веды і ўключацца ў працэс дынамічнай мадэрнізацыі.

Распаўсюджванне школ пры заводах і фабрыках было, бадай, самай эфектыўнай і самай запатрабаванай формай арганізацыі адукацыі для рабочага класа. Жаданне працаваць і атрымліваць усе сацыяльныя выгоды, якія атрымліваў рабочы завода ў горадзе, падштурхала супрацоўнікаў вучыца ў школах рабочай моладзі. Пры Мінскім трактарным заводзе працавала вячэрняя школа № 7, будынак для якой пабудавалі самі трактаразавадчане. Такія школы існавалі пры аўтамабільным, мотавела заводзе, Інтэграле, Гомсельмашы, Аршанскім льнакамбінаце, Лідскай абутковай фабрыке і інш. [2, с. 116].

Практыка мадэрнізацыі ў сваім інструментарыі мела розныя элементы. Так, напрыклад, заахвочванне працоўных сацыяльна-пабытовымі каштоўнасцямі такімі як, аплачваемая праца, жыллё ў горадзе, наяўнасць пунктаў пабытовага абслугоўвання, дзіцячых садкоў, магазінаў, бальніц і паліклінік, павінны былі стымуляваць уладкоўвацца рабочых на прамысловае прадпрыемства.

Асноўныя надзеі на вырашэнне пытання з жыллём і забеспячэнне неабходнымі сацыяльна-пабытовымі паслугамі звязваліся з самімі прамысловымі прадпрыемствамі. Паўсюдна папулярызаваўся досвед працоўных горада Горкага, якія самастойна ўзводзілі квадратныя метры і спадарожныя аб'екты. У 50-я гг. 50 %, а ў 1960 г. 73,3 % жылога фонду г. Мінска належала прамысловым прадпрыемствам) [2, с. 240], Рабочыя Мінскага аўтазавода пабудавалі для сябе 7 000 квадратных метраў, дзе трактаразаводцы занялі 25 дамоў (135 сем'яў). Завадчанамі будаваліся інтэрнаты, дзіцячыя сады, камбінаты бытавога абслугоўвання, школы, паліклінікі, бальніцы, здраўпункты інш. Сіламі жыхароў завадскіх раёнаў арганізоўваліся рухі: «За высокую санітарную культуру вуліц», «Азеляненне двароў» і інш. [2, с. 389].

Выразнае разуменне таго, што «суб’ект мадэрнізацыі» павінен быў быць здаровай, гарманічна развітай, фізічна падрыхтаванай, загартаванай асобай, прысутнічала паўсюдна. Пра гэта сведчыць той факт, што на прадпрыемствах павялічвалася колькасць здраўпунктаў, медыцынскіх кабінетаў, узмацняўся кантроль за выкананнем правіл бяспекі на вытворчасці, скарачаўся працоўны дзень. Доказам актыўнай працы з’яўляюцца шматлікія агітацыйныя плакаты, якія захаваліся да нашых дзён [7]. Назіралася станоўчая дынаміка спажывання прадуктаў. З 1953 па 1959 гг. на аднаго члена рабочай сям'і спажыванне хлеба знізілася на 18 працэнтаў, малака і малочных прадуктаў павялічылася ў 1,5 раза, садавіны і агародніны павялічылася ў 2,5 разы [2, с. 385]. Рэалізоваліся планы па фізічнаму выхаванню. Так, вялікая ўвага надавалася падрыхтоўкі да здачы норм ГПА – гатовы да працы і абароны.

Такім чынам, практыка мадэрнізацыі, якая прадугледжвала ажыццяўленне навуковай рэвалюцыі ў прамысловай сферы і дынамічную індустрыялізацыю Савецкай Беларусі выклікала істотныя сацыяльна-дэмаграфічныя змены ў грамадстве БССР у 50–60-х гг. XX ст. Змены выражаліся ў пераездзе сельскіх жыхароў у горад. Горад павінен стаць цэнтрам «выхавання» новых гараджан – працоўных заводаў, камбінатаў, будоўляў. Стымулам папаўнення шэрагаў рабочых стала арганізаваная Партыяй праграма паўсямеснай сярэдняй і прафесійнай адукацыі, школ рабочай моладзі і іншых форм ўдасканалення ведаў. Фарміравалася ўстойлівае ўяленне грамадскасці аб значнасці адукацыі для эканамічнага прагрэсу. Таксама шырокае распасюджванне атрамала папулярызацыя каштоўнасці сацыяльных выгод для супрацоўнікаў прадпрыемстваў такіх, як жыллё і гарадская інфраструктура.

Праўда, сцэнарый фарміравання рабочага класа і развіцця беларускага горада ў БССР меў адметнасці і свае асаблівасці. Спецыфічнай рысай ўрбанізацаыі стала «асялянванне» горада – перанос вясковай абшчыннасці і патрыярхальнасці ў гарадскія ўмовы жыцця рабочых. Амаль кожны буйны цэнтр у Беларусі нагадваў «гарадскую вёску». Складанае жыццё у горадзе вымушала жыхароў падтрымліваць цесныя зямляцкія адносіны з правінцыяй каб мець прадукты. Нярэдка рабочыя былі «часовымі» і працавалі толькі некаторы час (змену, вахту). Імклівым ростам колькасці рабочых як класа адрознівалася бадай толькі сталіца. Шэраг складанасцей, з якімі сутыкнулася беларускае савецкае грамадства на этапе імклівых эканамічных змен, былі выдаткамі дынамізма працэсаў мадэрнізацыі.

## Бібліяграфічны спіс

1. *Воейков, М. И.* К вопросу о колличественном и качественном составе рабочего класса / М. И. Воейков, // Рабочий класс в процессах модернизации России: исторический опыт: сб. статей. – М.: Экономическая демократия. 2001. – С. 166–175.

1. Истрия рабочего класса Белорусской ССР: в 4 т. / редкол: И. Е. Марченко [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1987. – Т. 4; Рабочий класс БССР на этапе совершенствования социализма (1961–1986). Минск: Наука и техника, 1987. – 484 с.

2. *Маржалава, Т. В.* Партыйна-дзяржаўная палітыка ў сферы арганізацыйнай перабудовы агульнаадукацыйнай школы БССР (1945–1959 гг.) / Т. Маржала // Актуальныя праблемы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці: матэрыялы рэсп. навук-практ. канф., Мінск, 17 февр., 2009 г.: в 2 ч. – Минск, 2009. – Ч. 2. – С. 60–63.

3. *Побережников, И. В.* Переход от традиционного к информационному обществу: теоретико-методологические поблемы модернизации. / И. В. Побережников. – М., 2006. – 240 с.

4. *Романов, П. В., Ярская-Смирнова, Е. Р.* Риторика и практика модернизации: советская социальная политика, 1917–1930-е года / П. В. Романов, Е. Р. Ярская-Смирнова // Социальная история. Ежегодник, 2009. – СПб., 2010. – С. 275–287.

5. *Риер, Я. Г.* Историческая демография: уч пособие / Я. Г. Риер. – 2-е изд. – Могилёв: МГУ им. А. Кулешова, 2006. – 160 с.

6. https://aif.by/timefree/sport/moda_na_zdorove_yarkie_sovetskie_plakaty_o_sporte/Дата доступа 26.05.2023.